**15 ліпеня –140 гадоў з дня нараджэння Цёткі (А.С. Пашкевіч) (1876–1916), грамадска-культурнай дзяячкі, пісьменніцы, асветніцы, педагога, выдаўца, удзельніцы рэвалюцыйнага руху**

Алаіза Сцяпанаўна Пашкевіч (найбольш вядомая пад псеўданімам Цётка) належыць да таго пакалення беларускіх дзеячаў апошняй чвэрці XIX – пачатку XX ст., якое ўнесла неацэнны ўклад у айчынную культуру і літаратуру. На думку пісьменніцы В. Коўтун, «вершы, празаічныя творы, творы для дзяцей, публіцыстыка Цёткі ўвабралі ў сябе ўсё лепшае з педагагічна-выхаваўчай мудрасці народа»*.

Нарадзілася будучая пісьменніца ў фальварку Пешчын Лідскага павета Віленскай губерні (цяпер Шчучынскі раён Гродзенскай вобласці) у шляхецкай сям'і. Яна атрымала добрую хатнюю адукацыю і ў 1894 г. паступіла адразу ў чацвёрты клас Віленскага прыватнага жаночага вучылішча В.М. Прозаравай, якое скончыла ў 1901 г. Некаторы час настаўнічала ў вёсцы. З 1902 па 1904 г. вучылася на курсах П.Ф. Лесгафта ў Санкт-Пецярбургу, у 1904 г. здала экстэрнам экзамены за курс Аляксандраўскай жаночай гімназіі. У сталіцы А. Пашкевіч апынулася ў цэнтры рэвалюцыйнага руху. Яна ўключылася ў работу нелегальных студэнцкіх арганізацый, з'ўлялася актыўным членам гуртка «Круг беларускай народнай прасветы», удзельнічала ў стварэнні Беларускай сацыялістычнай грамады.

У 1904 г. вярнулася ў Вільню. Працавала фельчарам у псіхіятрычнай Нова-Вілейскай бальніцы і працягвала рэвалюцыйную дзейнасць. Выступала з прамовамі на мітынгах, сходах, маніфестацыях, стварала нелегальныя гурткі, распаўсюджвала антыўрадавыя пракламацыі, пісала вольналюбівыя вершы, была дэлегатам на з'ездзе жанчын у Маскве. Паражэнне рэвалюцыі 1905 г. і ўзмацненне рэпрэсій царскага ўрада прымусілі Цётку перайсці на нелегальнае становішча. У снежні 1905 г. яна пакінула Вільню і пераехала ў Галіцыю, якая тады была часткай Аўстра-Венгерскай Імперыі. Жыла спачатку ў Львове, дзе з'ўлялася вольнай слухачкай філасофскага факультэта Львоўскага ўніверсітэта. Нягледзячы на цяжкае матэрыяльнае становішча, Цётка ў 1906 г. у Жоўкве (каля Львова) надрукавала зборнікі рэвалюцыйных вершаў «Хрэст на свабоду» і «Скрыпка беларуская». Некалькі разоў нелегальна прыязджала ў Вільню, дзе ўдзельнічала ў выданні газеты «Наша доля», у першым нумары якой было апублікавана яе апавяданне «Прысяга над крывавымі разорамі» (1906). З 1908 па 1909 г. Цётка жыла ў Кракаве. Вучылася на гуманітарным факультэце Ягелонскага ўніверсітэта, з'ўлялася членам рэвалюцыйнай арганізацыі ўніверсітэцкай моладзі «Спуйня» («Згуртаванасць»), займалася вывучэннем фальклору і гісторыі беларускага народнага тэатра (аўтар брашуры «Праграма для збірання матэрыялаў аб батлейках на Беларусі», 1910). Некаторы час Цётка жыла ў Закапанэ (Польшча), дзе праходзіла курс лячэння ад туберкулёзу, выязджала ў Германію і Італію. У эміграцыі ў лютым 1911 г. выйшла замуж за інжынера, актыўнага дзеяча літоўскай сацыял-дэмакратыі С. Кайрыса. Змена прозвішча дала магчымасць у 1912 г. вярнуцца на радзіму.

У Вільні актыўна ўключылася ў грамадска-асветніцкую дзейнасць. З тэатрам І. Буйніцкага выступала як актрыса ў розных кутках Беларусі (удзельнічала ў спектаклях «Па рэвізіі» М. Крапіўніцкага і «У зімовы вечар» паводле Э. Ажэшкі). У Вільні, Нова-Вілейцы і Лідзе арганізавала некалькі тайных беларускіх школ, у 1914 г. стала заснавальніцай і рэдактарам першага беларускага часопіса для дзяцей і моладзі «Лучынка» (Мінск). У час Першай сусветнай вайны была цесна звязана з Беларускім таварыствам дапамогі ахвярам вайны. Працавала сястрой міласэрнасці ў тыфозным салдацкім бараку, удзельнічала ў стварэнні дзіцячых прытулкаў, на настаўніцкіх курсах чытала педагогіку, гігіену і іншыя прадметы. У пачатку студзеня 1916 г. Цётка прыехала на пахаванне бацькі. У Лідскім

павеце лютавала эпідэмія тыфу і пісьменніца засталася дапамагаць хворым. Ратуючы землякоў, захварэла і 17 лютага памерла (пахавана ў фальварку Стары Двор пад Лідай).

Літаратурная спадчына Цёткі (паэзія, проза, публіцыстыка) сведчыць пра тое, што яна была асобай яркай і таленавітай. Пісаць пачала ў 1902 г. пад уплывам Ф. Багушэвіча. Самымі раннімі з вядомых твораў лічацца вершы «Лета» і «Восень», апублікаваныя ў зборніку «Скрыпка беларуская». У іх па-майстэрску перададзены асобныя моманты сялянскай працы, апісваюцца летнія ігрышчы і восеньскі кірмаш. У «Каляднай пісанцы на 1904 год» і «Велікоднай пісанцы» (1904) надрукавала вершы «Мужыцкая доля», «Мужык не змяніўся», «Нямаш, але будзе», «Музыкант беларускі», прасякнутыя спачуваннем цяжкай долі селяніна. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. стала для пісьменніцы сапраўдным імпульсам. Для твораў гэтага перыяду характэрны публіцыстычная завостранасць, рэвалюцыйны пафас, прамоўніцкія інтанацыі, метафарычнасць і алегорыя. Вершы «Мора», «Хрэст на свабоду», «Вера беларуса» і іншыя сталі хрэстаматыйнымі, заклікалі народ на барацьбу з царызмам. У вершах 1908–1914 гг. («З чужыны», «Грайка», «На магіле», «На чужой старонцы», «Арлы-брацця, дайце скрыдлы», «Сірацінка», «Вясковым кабетам», «Гаданне» і інш.) пераважаюць матывы грамадзянскай журбы і смутку, тугі па радзіме. Вялікую цікавасць прадстаўляюць празаічныя творы пісьменніцы. Апавяданні «Навагодні ліст» (1908), «Лішняя» і «Асеннія лісты» (1912), «Зялёнка» (1913), «Міхаська» (1914) прасякнуты гуманізмам, спачуваннем да чалавека працы, непрыняццем несправядлівасці. Пісала Цётка і творы для дзяцей (апавяданні, загадкі, прыказкі, прымаўкі, вершы). Яна з'яўляецца аўтарам вучэбных кніжак «Гасцінец для малых дзяцей» і «Першае чытанне для дзетак беларусаў» (1906), у рукапісе застаўся яе «Малітоўнік для беларускіх дзетак». Публіцыстыка Цёткі па аб'ёме амаль роўная з прозай. У артыкулах, што друкаваліся ў газеце «Наша Ніва» і часопісе «Лучынка», выявіліся асветніцкія погляды пісьменніцы. Яна звярталася да моладзі з заклікам старанна вучыцца, шанаваць родную мову, рыхтавацца да грамадскай дзейнасці. Асобную старонку публіцыстычнага жанру складаюць дарожныя нататкі і нарысы, напісаныя пад уражаннем падарожжаў у Італію, Фінляндыю, Швецыю, Германію.

Творчая спадчына Цёткі – яркая старонка ў гісторыі беларускай літаратуры. Яе самабытны талент заўважыў Я. Купала і ў 1907 г. прысвяціў пісьменніцы верш «Аўтарцы „Скрыпкі беларускай”». Творы А. Пашкевіч перакладзены на рускую, украінскую, польскую, нямецкую і іншыя мовы. Да вобраза Цёткі звяртаюцца многія прадстаўнікі беларускай літаратуры і мастацтва. У гонар пісьменніцы пастаўлены помнікі ў г. Шчучыне, г. п. Астрына, у в. Шастакоўцы (Шчучынскі раён), адкрыта мемарыяльная дошка ў Мінску. Яе імем названа школа ў г. п. Астрына, адна з бібліятэк беларускай сталіцы, вуліцы ў Мінску, Маладзечне і Шчучыне.

* Цыт. па: Выбраныя творы / Цётка. Мінск, 2001. С. 37.